

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН РЭКТАРАТА, ПАРТКОМА, ПРАФКОМАЎ, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА
ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

№ 4 (159) 29 СТУДЗЕНЯ 1991 ГОДА


## ПРА НАВУКОВУЮ СПАДЧЫНУ ЗЕМЛЯКА

### *Да 130-ых угодкаў Я. Карскага*

Імя нашага слыннага земляка акадэміка Яўхіма Карскага добра ведаюць ва ўсіх славянскіх краінах і асяродках славянскай культуры свету. Ён вывучаў і даследаваў не толькі беларускую, рускую і ўкраінскую, але і польскую, чэшскую, сербахарвацкую і балгарскую мовы. З сямісот сваіх навуковых прац большую частку Я. Карскі прысвяціў мове свайго народа — беларускай. Яго фундаментальнае даследаванне «Беларусы» (шэсць кніг) — сапраўдная энцыклапедыя беларускага народа. Наш зямляк упершыню стварыў этнаграфічную карту Беларусі, вызначыў межы этнічнай тэрыторыі беларусаў.

Яўхім Карскі нарадзіўся 1 студзеня 1861 года ў вёсцы Лаша Гродзенскага павета. Вучыўся ў народных вучылішчах Навагрудскага павета, у Мінскай семінарыі, у Нежынскім гісторыка-філалагічным інстытуце. Затым працаваў у Віленскай гімназіі, у Варшаўскім універсітэце. З 1905 па 1910 быў рэктарам Варшаўскага універсітэта. Доктар філалогіі, акадэмік, Я. Карскі зрабіў вялікі ўклад у славістычную навуку.

Пра навуковую спадчыну нашага земляка ішла гаворка на першых навуковых Чытаннях, якія адбыліся 15 студзеня 1991 года на філалагічным факультэце Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. Акрамя вучоных нашага універсітэта, у Чытаннях прынялі ўдзел навукоўцы з Ленінграда, з Акадэміі навук БССР і Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Леніна.

Пра родныя сцежкі Яўхіма Карскага эмацыянальна і змястоўна гаварыў Апанас Пятровіч Цыхун, вядомы краязнаўца, былы настаўнік Лашанскай школы, аўтар дзвюх рукапісных прац пра Я. Карскага. Дзейнасць Я. Карскага ў кантэксце беларускай культуры канца XIX — пачатку XX стагоддзяў асвятліў у сваім дакладзе дацэнт кафедры беларускай культуры нашага універсітэта А. М. Пяткевіч. Прафесар кафедры агульнага і рускага мовазнаўства Мінскага педагагічнага інстытута імя Горкага, аўтар грунтоўнай манаграфіі пра даследчыка славянскіх моў М. Г. Булахаў выступіў з дакладам «Карскі як русіст і палеограф».

Пра даследаванне Я. Карскім словаўтваральнай сістэмы беларускай мовы зрабіў даклад прафесар П. У. Сцяцко. Загадчык аддзела славянскага і тэарэтычнага мовазнаўства інстытута мовазнаўства Акадэміі навук БССР Г. А. Цыхун расказаў пра беларуска-іншаславянскія паралелі ў працах Карскага. Вялікую цікавасць выклікаў даклад дацэнта кафедры беларускай літаратуры нашага універсітэта І. В. Жука на тэму «Дыскусія 1923 года вакол «Беларусаў» Карскага». З паведамленнем «Сказанне аб Сівілепрарочыцы» ў даследванні Я. Карскага і пытанні структуры і стылістыкі тэксту» выступіла прафесар кафедры рускай мовы БДУ А. І. Яновіч. Загадчыца кафедры рускай мовы нашага універсітэта дацэнт М. В. Канюшкевіч разгледзела параўнальна-супастаўляльны сінтаксіс у «Беларусах» Я. Карскага.

**П. СЦЯЦКО.**

## ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

**На апошнім агульнауніверсітэцкім партыйным сходзе камуністы абмяркоўвалі асноўныя напрамкі «ПРАГРАМЫ ДЗЕЙНАСЦІ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ Ў СВЯТЛЕ РАШЭННЯЎ XXVIII З ´ЕЗДА КПСС І XXXI З ´ЕЗДА КПБ».**

**Публікуем тэкст Праграмы з улікам прапаноў і дапаўненняў, выказаных камуністамі на сходзе.**

# ПРАГРАМА

## ДЗЕЙНАСЦІ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ГрДзУ ІМЯ Я. КУПАЛЫ Ў СВЯТЛЕ РАШЭННЯЎ XXVIII З ´ЕЗДА КПСС І XXXI З ´ЕЗДА КПБ.

Партыйная арганізацыя універсітэта, пацвярджаючы вернасць ідэям Кастрычніка і сацыялізма, падтрымліваючы выпрацаваныя XXVIII з ´ездам КПСС і XXXI з ´ездам Кампартыі Беларусі асноўныя напрамкі партыйнай палітыкі, будзе сканцэнтроўваць усе намаганні на забеспячэнне адзінства сваіх радоў, на выпрацоўку і рэалізацыю практычных мер па забеспячэнню стабільнасці палітычнай, сацыяльнай і маральнай абстаноўкі ва універсітэце.

Сваю авангардную ролю партыйная арганізацыя будзе зацвярджаць практычнымі справамі па перабудове ўсіх бакоў жыцця універсітэта, дзейнічаючы палітычнымі метадамі праз факультэцкія (цэхавыя) партарганізацыі, партком і партбюро, камуністаў, працуючых у саветах універсітэта і факультэтаў, у камсамольскіх і прафсаюзных арганізацыях. Партком і партбюро будуць будаваць унутрыпартыйныя адносіны на аснове ідэйнай супольнасці і партыйнага таварыства, свядомай дысцыпліны, адзінства слова і справы. Будуць дабівацца рашучага размежавання з тымі, хто стаў на антыкамуністычныя пазіцыі, адхіляе ідэйна-палітычныя і арганізацыйныя асновы партыі, вядзе справу да яе развалу.

Партыйная арганізацыя адхіляе ўсякага роду нападкі на КПСС і КПБ, незаконныя патрабаванні аб дэпалітызацыі навучальных установ, у тым ліку універсітэта, і выказваецца за захаванне сеткі факультэцкіх партыйных арганізацый. Камуністы будуць актыўна супрацьдзейнічаць антысацыялістычным сілам, рашуча выступаць супраць здзекавання над памяццю Маркса, Энгельса, Леніна, іншых вядомых дзеячоў рэвалюцыйнага руху, супраць дыскрэдытацыі іх тэорыі і асоб, супраць фактаў вандалізму і здзекаў над помнікамі дзеячам рэвалюцыі, Савецкай дзяржавы, над сімваламі нашай дзяржаўнасці і айчыннай культуры, над магіламі воінаў, загінуўшых у баях за Радзіму.

Камуністы партыйнай арганізацыі будуць дабівацца таго, каб адукацыя і выхаванне ва універсітэце як дзяржаўнай навучальнай установе базіраваліся на канстытуцыйных палажэннях, у якіх замацаваны сацыялістычны выбар, на прынцыпах сацыялістычнай маральнасці.

Партыйная арганізацыя будзе весці работу па гуманітарызацыі адукацыі, перабудове выкладання сацыяльна-палітычных дысцыплін, якія б давалі спецыялісту комплекс гістарычных, філасофскіх, эканамічных, палітычных і культуралагічных ведаў.

Партыйная арганізацыя будзе ўсебакова падтрымліваць і пераўтвараць ў жыццё адобраную працоўным калектывам праграму развіцця універсітэта.

### САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫЯ ПЫТАННІ

У нашым грамадстве разгарнуліся глыбокія палітычныя і сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні, якія здзяйсняюцца ў складаных умовах эканамічнага і палітычнага крызісу, які ўсё больш паглыбляецца, распада гаспадарчых сувязяў, скарачэння аб ´ёму вытворчасці і нацыянальнага даходу. З ´явіліся такія непрыглядныя рысы нашай рэчаіснасці, рэзка зніжаючыя ўзровень жыцця многіх камуністаў і беспартыйных з ліку супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта, як рост цэн, татальны дэфіцыт, спекуляцыя, нахабны злачынны свет, непатухаючыя ачагі міжнацыянальных канфліктаў, якія выклікалі таможныя бар ´еры па перамяшчэнню рэспублікамі харчовых і прамысловых тавараў і г. д.

Партыйная арганізацыя універсітэта, выступаючы за фарміраванне грамадзянскага таварыства, у якім не чалавек існуе дзеля дзяржавы, а дзяржава — дзеля чалавека, асноўнымі задачамі лічыць: забеспячэнне спрыяльных умоў жыцця савецкага грамадзяніна; адстойванне яго інтарэсаў; правядзенне актыўнай барацьбы супраць любых спроб згортвання сацыяльных праграм, ушчымлення інтарэсаў працоўных.

Цалкам падтрымліваючы праграмную заяву XXVIII з ´езда КПСС «Да гуманнага, дэмакратычнага сацыялізма», партарганізацыя ГрДзУ лічыць, што абавязана мець сваю дакладную пазіцыю ў адносінах да сацыяльна-эканамічных пытанняў і культуры супрацоўнікаў і студэнтаў Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта на перыяд пераходу да рыначнай эканомікі. Пры гэтым камуністы праяўляюць упэўненасць, што вырашыць вышэйуказаныя задачы можна толькі сумеснымі намаганнямі з рэктаратам, прафкомамі, камсамольскай арганізацыяй універсітэта, з Саветамі народных дэпутатаў, партыйнымі і іншымі грамадскімі арганізацыямі і аб ´яднаннямі працоўных горада.

Партарганізацыя лічыць неабходным распрацаваць універсітэцкую сістэму сацыяльнай абароны і матэрыяльнай падтрымкі выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў, дабіваючыся, каб узровень іх даходаў за кошт зарплаты, стыпендый, пенсій і дапамогі быў не ніжэйшым пражытачнага мінімуму. Рэалізацыя праграмы павінна забяспечыць:

— кожнаму чалавеку сацыяльна-гарантаваны ўзровень прадстаўлення жылля (кватэр і інтэрнатаў), стварэнне ў інтэрнатах нармальных ўмоў для пражывання студэнтаў і іншых катэгорый супрацоўнікаў ГрДзУ;

— медыцынскае абслугоўванне;

— паляпшэнне набору асартыменту прадуктаў і якасць прыгатавання стравы ў сталовай і буфетах універсітэта;

— павышэнне стыпендый студэнтам і аспірантам;

— забеспячэнне супрацоўнікаў і студэнтаў прамысловымі таварамі першай неабходнасці па дзяржаўных, а не па рыначных цэнах;

— паляпшэнне ўмоў працы і быту жанчын;

— даваць дзецям дашкольнага ўзросту супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта дзіцячыя сады-яслі;

— паляпшэнне становішча інвалідаў, ветэранаў, воінаў-інтэрнацыяналістаў, сем ´яў загінуўшых ваеннаслужачых і пацярпеўшых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС;

— падтрымка разнастайных відаў кааператыўнай уласнасці і ўласнасці грамадскіх арганізацый; працоўнага ўдзелу студэнтаў у будаўнічых атрадах, аграпрамысловым комплексе і г. д.

— абаронныя механізмы пры пераходзе да рыначнай эканомікі, звяртаючы ўвагу на кампенсаванне страт супрацоўнікам і студэнтам ГрДзУ, звязаных з пераглядам рознічных цэн на тавары і паслугі, кантраляваць дзейнасць сістэмы індэксацыі грашовых даходаў у залежнасці ад росту спажывецкіх цэн;

— дзейсны механізм падтрымкі занятасці, працаўладкавання і прафесіянальнай перападрыхтоўкі, забеспячэнне выплаты дапамогі на перыяд часовай незанятасці, перавучвання і перакваліфікацыі;

— павелічэнне дзяржаўных асігнаванняў на навучальны працэс і фундаментальныя даследаванні;

— умацаванне базы навукі, развіццё бібліятэкі, архіва, інфармацыйнай тэхнікі;

— даступнасць усіх да культурных каштоўнасцей, да культурнай спадчыны народаў СССР, усеагульнай эстэтычнай асветы;

— рэгулярнае культурнае правядзенне вольнага часу і спартыўна-масавых мерапрыемстваў.

### ІДЭАЛАГІЧНАЯ РАБОТА

У цэнтр ідэалагічнай работы партарганізацыя універсітэта ставіць канкрэтнага члена калектыву. Практычны напрамак ідэалагічнай работы, яго метадалогію складаюць і вызначаюць рашэнні XXVIII з ´езда КПСС і XXXI з ´езда КПБ.

Асноўнай задачай ідэалагічнай работы на сучасным этапе развіцця грамадства партарганізацыя лічыць усемагчымую прапаганду і падтрымку ў калектыве універсітэта і за яго межамі тэорыі і практыкі перабудовы, абнаўлення сацыялізма, умацавання Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, выпрацоўку ў кожнага камуніста і беспартыйнага, выкладчыка, супрацоўніка, студэнта яснай жыццёвай пазіцыі і актыўнага ўдзелу ў гэтым стваральным працэсе.

У сувязі з гэтым партарганізацыя выступае супраць недаацэнкі ролі марксісцка-ленінскай тэорыі, невыпатрабаванасці ўсіх яе багаццяў за паслядоўны творчы падыход да вывучэння тэорыі і практыкі сацыялізма, асэнсаванне гістарычнага вопыту XX стагоддзя, спадчыны К. Маркса, Ф. Энгельса, У. І. Леніна, іншых дасягненняў рэвалюцыйнай і прагрэсіўнай думкі. Асноўная нагрузка ў гэтым напрамку кладзецца на камуністаў кафедр палітычных і сацыяльных навук.

Сёння, як ніколі, узрастае роля падрыхтаванага ідыёлага-прапагандыста, агітатара, лектара, валодаючага не толькі прафесіянальнымі ведамі і шырокай эрудыцыяй, але і высокай палітычнай культурай, здольнага весці палеміку, ясна выкладаць свае пазіцыі, мэтанакіравана ўплываць на аудыторыю. Гэтаму павінна служыць адроджаная палітычная вучоба, пошук яе новых форм. Для пярвічных партаргаізацый факультэтаў такой формай можа быць дыскусійны клуб «Дыялог», для камуністаў кафедр — кафедральныя і міжкафедральныя методыка-метадалагічныя семінары, для студэнтаў — маладзёжная гасціная «Студэнт і час». Для клуба «Дыялог» рэкамендуецца наступная прыкладная тэматыка, звязаная з абмеркаваннем матэрыялаў XXVIII з ´езда КПСС і XXXI з ´езда КПБ, наступных пленумаў ЦК КПСС і ЦК КПБ:

а). КПСС на шляху абнаўлення. Што даў XXVIII з ´езд партыі і народу?

б). Гуманны, дэмакратычны сацыялізм. Якім мы яго бачым?

в). Рэгулюемы рынак — мара або рэальнасць?

г). Ідэалогія, навука, культура ў сучаснай перабудоўчай палітыцы КПСС.

д). КПСС і міласэрнасць: ці ёсць кропкі сутыкнення?

е). КПСС і моладзь: хто на чыім баку?

ж). КПБ ва ўмовах шматпартыйнасці: праблемы і рашэнні.

На кафедральных і міжкафедральных (факультэцкіх) семінарах неабходна спалучаць абмеркаванне актуальных ідэйна-тэарэтычных і навукова-метадалагічных аспектаў дысцыплін, забяспечваемых кожнай канкрэтнай кафедрай, сацыяльных вынікаў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, значэння гуманітарных грамадазнаўчых ведаў, навукі ў рашэнні праблем бурнага развіцця сучаснага грамадства.

(Працяг на стар. 2)

# ПРАГРАМА

## ДЗЕЙНАСЦІ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ГрДзУ ІМЯ Я. КУПАЛЫ Ў СВЯТЛЕ РАШЭННЯЎ XXVIII З ´ЕЗДА КПСС І XXXI З ´ЕЗДА КПБ.

**(Працяг, пачатак на стар. 1)**

У гасцінай «Студэнт і час» мэтазгодна разглядаць пытанні тэорыі і практыкі жыцця студэнтаў, моладзі, маладых спецыялістаў ва ўмовах перабудовы, іх ролі і месцы ў замацаванні і паглыбленні яе пазітыўных працэсаў.

Неабходна шырока ўкараняць самаадукацыю, самастойнае вывучэнне марксісцка-ленінскай спадчыны. Трэба смялей ісці на стварэнне дыскусійных клубаў, развіваць гарызантальныя структуры, дапамагаючыя камуністам выпрацаваць асабістыя пазіцыі. Пры гэтым не замыкацца ў сваім партыйным асяроддзі, а смела ісці на дыялог з прадстаўнікамі розных рухаў і арганізацый. Апошняе патрабуе пастаяннага атрымання поўнай і аб´ектыўнай інфармацыі па ўсіх пытаннях, звязаных з жыццядзейнасцю партыі, краіны, рэспублікі, мясцовага рэгіёну. З гэтай мэтай лічыць мэтазгодным у калектыве універсітэта, факультэтаў рэгулярна арганізоўваць выступленні дэлегатаў XXVIII з´езда КПСС і XXXI з´езда КПБ, народных дэпутатаў СССР і БССР, мабільных інфармацыйных груп Гродзенскага ГК КПБ, сустрэчы з кіраўнікамі партый і грамадска-палітычных рухаў, функцыяніруючых ва універсітэце і рэгіёне.

У ажыццяўленні камуністамі выхаваўчай работы, забяспечваючай станоўчае ўздзеянне на маральна-псіхалагічны клімат у калектыве універсітэта, у арганізацыі і правядзенні мерапрыемстваў, прысвечаных дзяржаўным і прафесіянальным святам (гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі, дню нараджэння У. І. Леніна, 1 Мая, святу Перамогі, Дню навукі і іншым), у масава-палітычных акцыях, якія праводзяцца ў сценах вуза і ў студэнцкіх інтэрнатах, неабходна шырэй выкарыстоўваць простыя і даступныя сродкі ўздзеяння на свядомасць людзей — газету «Гродзенскі універсітэт», насценны друк, лістоўкі, рукапісныя плакаты, лозунгі, звароты, заўвагі. Дзейнасць гэтых сродкаў — у іх апаратыўнасці.

Пераўтварэнне ў жыццё платформы КПСС «Аб нацыянальнай палітыцы партый ў сучасных умовах», заключэнне новага саюзнага дагавору, напрамкі дзейнасці камуністаў універсітэта па фарміраванню палітычнай культуры выкладчыкаў і студэнтаў неабходна перыядычна разглядаць на парткоме, партыйных бюро партарганізацый факультэтаў і падраздзяленняў, мэтазгодна вынесці на абмеркаванне агульнауніверсітэцкага партыйнага сходу.

Вялікае практычнае і ідэйна-палітычнае значэнне надае партарганізацыя ўдзелу ў выкананні абласных комплексных праграм «Родная мова», «Спадчына», «Сям´я», рэалізацыі ва універсітэце ўвайшоўшага ў сілу з 1 верасня 1990 года «Закона аб мовах у Беларускай ССР», павышэнню ролі прафесарска-выкладчыцкага саставу і студэнцтва ў нацыянальным адраджэнні і здзяйсненні суверэнітэта Беларусі, даследаванні вучонымі ўсіх кафедр праблематыкі беларускага рэгіёну, яго гісторыі і культуры.

Парткому сумесна з сацыялагічнай лабараторыяй неабходна наладзіць вывучэнне думкі выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў па найбольш важных пытаннях жыцця універсітэта, рэспублікі і краіны.

Партбюро факультэтаў прадумаць і здзейсніць новыя формы выкарыстання насценных газет.

У эфектыўнасці ідэалагічнай работы партарганізацыі вялікая роля ідэйнага з´яднання камуністаў, іх цярпення і вытрымкі, адсутнасць панікі, вывучэння і ўліку грамадскай думкі, аналізу вынікаў. Трэба рабіць вывады з памылак, не баяцца смелых рашэнняў, учынкаў, пазбягаць фармалізму і шаблону, падтрымліваць грамадска-значныя ініцыятывы, якія нараджаюцца ў калектыве, міжнацыянальную і міжпартыйную згоду і супрацоўніцтва, актыўна супрацьстаяць ідэям і дзеянням, якія чужыя сацыялізму.

### СУВЯЗЬ З ГРАМАДСКІМІ АРГАНІЗАЦЫЯМІ

Партыйная арганізацыя універсітэта адкрыта да ўзаемадзеяння і супрацоўніцтва з усімі грамадска-палітычнымі арганізацыямі сацыялістычнай, гуманістычнай, дэмакратычнай арыентацыі, будзе весці з імі абмен думкамі, арганізоўваць інфармацыйныя сустрэчы, «круглыя сталы», публічныя дыскусіі з мэтай лепшага разумення пазіцыі партнёраў, выявіць магчымасці згоды і супрацоўніцтва. Разам з тым яна будзе выкрываць сапраўдныя мэты і імкненні тых, хто займае антыкамуністычныя пазіцыі, супрацьстаяць дзейнасці любых дэструктыўных і экстрэмісцкіх сіл.

Камуністы універсітэта зацікаўлены ў павышэнні дзеяздольнасці прафсаюзных арганізацый, больш эфектыўным адстойванні імі правоў і законных інтарэсаў сваіх членаў. Партыйная арганізацыя будзе аказваць ім дапамогу і падтрымку, патрабаваць ад працуючых у прафсаюзных органах камуністаў добрасумленнага выканання сваіх абавязкаў, актыўнай пазіцыі ў захаванні адзінства прафсаюзных арганізацый, супрацьдзеяння прымяненню прафсаюзнымі арганізацыямі папулісцкіх метадаў дзейнасці.

Партыйная арганізацыя выступае за ідэйнае і арганізацыйнае супрацоўніцтва з камсамольскай і іншымі маладзёжнымі арганізацыямі сацыялістычнай арыентацыі. Прыярытэтнай задачай яна лічыць захаванне ва універсітэце дзеяздольнай камсамольскай арганізаці, не страціўшай яснай грамадска-палітычнай арыентацыі. Неабходна ўсяляк падтрымліваць усе грамадска — значныя маладзёжныя ініцыятывы ва універсітэце, актыўна садзейнічаць стварэнню універсітэцкага фонду сацыяльнай абароны студэнтаў. Устанавіць імянную студэнцкую стыпендыю партыйнай арганізацыі. Больш настойліва дабівацца дзейсных мер па паляпшэнню ўмоў вучобы,быту і вольнага часу студэнтаў універсітэта.

### АРГАНІЗАЦЫЙНА-ПАРТЫЙНАЯ РАБОТА

Прыярытэтнымі напрамкамі ў арганізацыйна-партыйнай рабоце з´яўляюцца:

— забеспячэнне прытоку ў партыю новых сіл з ліку выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнцкай моладзі;

— правядзенне не менш аднаго сходу ў 1-2 месяцы, памятаючы пры гэтым, што чым больш крутыя падзеі, тым больш патрэбны калектыўны савет камуністаў;

— стварэнне камісій, экспертных груп з прыцягненнем да іх работы студэнцкай мола[…] для вывучэння, даследаван[…] розных сацыяльных і вытворч[…] праблем і іх безадкладнага выр[…]шэння;

— абмеркаванне на пар[…]ыйных сходах толькі праект[…] рашэнняў, а не дакладаў. Апо[…]нія могуць быць толькі камент[…]рыямі да іх;

— пастаяннае прынцыпова[…] абмеркаванне на партыйных схо[…]дах камуністаў-кіраўнікоў і ка[…]муністаў-спецыялістаў. Парт[…]ыйныя арганізацыі не будуц[…] умешвацца ў распараджальнук[…] дзейнасць адміністрацыі і несц[…] адказнасць за яе вынікі;

— недапушчальнасць у парт[…]ыйных арганізацыях фінансавага[…] ізаляцыянізму, які з´яўляецца[…] пагубным для партыі;

— падтрымка і выступленне[…] з ініцыятывамі правядзення розных дабрачынных акцый па збору сродкаў на аднаўленне і рэстаўрацыю помнікаў гісторыі і культуры Беларусі, выданне кніг[…] «Памяць»;

— стварэнне з сумы партыйных узносаў спецыяльнага фонду абароны інтарэсаў членаў партыі і аказання дапамогі тым, хто яе чакае;

— ажыццяўленне сістэмы мер па прававой сацыяльнай абароне прафесароў і выкладчыкаў універсітэта;

— зацвярджэнне і падтрымка духу таварыства, дабразычлівасці, узаемнай дапамогі ў партыйным асяроддзі. Выкараненне недаверу ў адносінах паміж камуністамі, недапушчальнасць праяў няроўнасці сярод членаў партыі ў залежнасці ад займаемага становішча ў грамадстве.

# З ПАСТАНОВЫ

## ПАРТЫЙНАГА СХОДУ:

1. Згадзіцца з праектам каштарыса расходаў.
2. Лічыць мэтазгодным пералічваць сабраныя за 1991 год членскія ўзносы на рахунак гаркома партыі.



# КАШТАРЫС

## РАСХОДАЎ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

**Усяго даходаў — 7.200 руб. (600 руб. у месяц).**

**Расходы па артыкулах**

| Артыкулы расходаў | У месяц (руб.) | У год (руб.) |
|---|---|---|
| 1. Стыпендыі студэнтам | 60 | 720 |
| 2. Зарплата тэхнічнаму сакратару | 60 | 720 |
| 3. Зарплата сакратару парткома | 225 | 2700 |
| 4. Сац.страх (26 працэнтаў ад зарплаты ў п. 2,3) | 74,1 | 885,2 |
| 5. Аказанне дапамогі камуністам, падпіска на партыйны друк і іншыя расходы | | 2.175.8 |
| УСЯГО | | 7.200 |

**Зацверджаны на партыйным сходзе Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы 17.01.91 г., пратакол № 1.**

**НАМ ПІШУЦЬ**

# ГАРАДЗЕНСКАЯ ХАРУГВА СКАЎТАЎ

Ну, вось нарэшце з´явілася першая зацікаўленасць беларускім адраджэннем і ў моладзі. З´явілася хоць якая-небудзь альтэрнатыва польскаму харцэрству. Пачала існаванне Гарадзенская харугва скаўтаў. Чаму менавіта такая назва? Напэўна таму, што арганізатары скаўтскага руху ў нашым горадзе ставяць сваёй галоўнай мэтай адраджэнне беларускасці і выхаванне дзяцей у нацыянальным духу. І таму звярнуліся да старабеларускай назвы «дружыны» — «харугва».

Прадстаўнік Гродзенскага скаўтства Сяргей Сяргеюк, студэнт другога курса фізічнага факультэта універсітэта ў сярэдзіне мінулага года пабываў на ўстаноўчым з´ездзе Рускіх скаўтаў у Маскве:

— З´езд праходзіў пад знакам расійскага адраджэння, таму пытанні падыходзілі больш для Расіі. Але было цікава паслухаць людзей, якія займаюцца гэтым на працягу многіх гадоў.

Напэўна не патрэбна нагадваць, што скаўтскі рух пачаў сваё жыццё ў Англіі. Ён так пашырыўся, што зараз існуе ў многіх краінах усяго свету. Але высновы для яго вельмі розныя, напэўна, таму і мае ён у нас шэраг асаблівасцей. Амаль ва ўсіх краінах бог з´яўляецца галоўнай часткай скаўтызму. Але мы так выхаваны, што растлумачыць дзецям, што такое бог, зможа не ўсякі. А арганізатарам скаўтскай харугвы ў Гародні самім па 18—20 гадоў. Акрамя таго, нашы скаўты добра ставяцца да ўсіх веравызнанняў.

Па-другое, перад нашымі скаўтамі стаіць галоўная задача: адрадзіць культуру і гісторыю роднай зямлі, зацікавіць гэтым моладзь, павысіць агульны ўзровень кожнага, дапамагчы размаўляць па-беларуску. Я гутарыла з першымі гродзенскімі скаўтамі дзявяностых гадоў. Уражанне? Добрыя хлопцы, якія неабыякава ставяцца да жыцця. Якім наскучылі толькі размовы аб беларусізацыі. Якія маюць ідэю і спадзяюцца: што-небудзь павінна атрымацца.

Яны не хочуць рыхтаваць нікому змены: ні камсамолу, ні піянерыі, ні нават «Паходні». Скаўтская харугва павінна быць дэпалітычный арганізацыяй, куды прымаюцца хлопцы і дзяўчынкі з 10 гадоў. Яшчэ няма ні грошай, ні матэрыяльнай базы, але абавязкова павінен працаваць летнік за горадам. Будуць свой сцяг, эмблема, форма. Але гэта як даніна гісторыі. Напэўна таму гродзенцы хочуць як эмблему ўзяць блакітны васілёк на белым фоне, а не лілію, як ва ўсіх.

Хлопцы не збіраюцца засяроджвацца на саміх сябе. Ужо зараз пачынаюць замацоўваць сувязі са скаўтамі Літвы і Польшчы.

Але пакуль што галоўнае — набыць грошы. Хто можа ім дапамагчы? Усе, у каго яны ёсць, лічыць адзін з арганізатараў Гродзенскай харугвы.

Тыя, каго зацікавілі скаўты, могуць пазваніць па тэлефонах: 31-83-84, 33-56-25.

**Н. ГРЫБ.**

**150-годдзю В. О. Ключэўскага на гістарычным факультэце была прысвечана студэнцкая вучэбна-практычная канферэнцыя. На канферэнцыі былі заслуханы паведамленні аб жыцці і навуковай дзейнасці вучонага, першых і наступных працах па айчыннай гісторыі, аб вяршыне яго навуковай творчасці — «Курсе рускай гісторыі», аб лектарскім і педагагічным майстэрстве гісторыка і інш. Сёння і часткова ў наступным нумары газеты мы пазнаёмім вас з фрагментамі выступленняў на канферэнцыі студэнтаў-гісторыкаў 4-га курса. Змяшчаем таксама некаторыя афарызмы Ключэўскага, выказванні аб гісторыі, аб народнай адукацыі, вершы і інш., падабранае дацэнтам В. М. Чарапіцай.**

**«ПРОГРЕСС МЫСЛИ В ТОМ, ЧТО ДОСТИГНУТУЮ ЦЕЛЬ ОНА ПРЕВРАЩАЕТ В СРЕДСТВО ДЛЯ ДАЛЬНЕЙШЕЙ ЦЕЛИ...»**

**В. О. КЛЮЧЭЎСКІ.**

# ЖЫЦЦЁВАЕ КРЭДА ВУЧОНАГА

«У жыцці вучонага і пісьменніка галоўныя бібліяграфічныя факты — кнігі, важнейшыя падзеі думкі»— так акрэсліў жыццёвае крэда свайго папярэдніка па кафедры рускай гісторыі Маскоўскага універсітэта С. М. Салаўёва буйнейшы айчынны гісторык другой паловы XIX — пачаткуXX стагоддзя Васіль Осіпавіч Ключэўскі (1841—1911гг.). Гэтага крэда прытрымліваўся ён і сам ў сваім напружаным, штотыднёва распісаным жыцці.

Кнігі і думкі адлюстроўвалі ўсю сутнасць унутранага жыцця гісторыка. Выхадзец з беднай сям ʼі сельскага свяшчэнніка, вельмі таленавіты і працаздольны, ён пачаў свой шлях у навуку адразу пасля адмены прыгоннага права ў Расіі і закончыў у перыяд паміж дзвюмя буржуазна-дэмакратычнымі рэвалюцыямі. У 70—80 гг. В. О. Ключэўскі дасягнуў сапраўднай ўсерасійскай вядомасці. Менавіта ў гэты час ім былі напісаны найлепшыя працы: «Древнерусские жития святых как исторический источник», «Боярская дума Древней Руси», «Происхождение крепостного права в России» і іншыя. Тады ж гісторык пачаў працаваць над асноўнай абагульняючай працай «Курс рускай гісторыі», які складаўся з лекцый, прачытаных аўтарам у Маскоўскім універсітэце і ў Маскоўскай духоўнай акадэміі. У 1904—1910 гг. выйшлі ў свет чатыры тамы «Курса». Пазней на аснове студэнцкіх запісаў быў выдадзены пяты том.

На працягу паўстагоддзя ў творчасці В. О. Ключэўскага праходзіў складаны працэс , які адлюстроўвае ўсю эвалюцыю яго поглядаў. Не ўсе яго сучаснікі маглі ўлавіць змены ў тэарэтычных палажэннях вучонага. Адно было відавочным — асноўным аб ʼектам даследавання гісторыка заставаўся народ. Гэта асаблівасць творчага інтарэсу выявілася яшчэ ў першай вялікай працы вучонага — «Сказание иностранцев о Московском государстве», працягнута яна была і ў «Курсе». Тут ён паслядоўна абгрунтаваў сваю канцэпцыю гістарычнага працэсу ў Расіі.

Вялікі поспех «Курса рускай гісторыі» пры жыцці аўтара і папулярнасць яго ў наш час тлумачыцца шэрагам прычын. Перш за ўсё «Курс» быў першай і, на жаль, адзінай спробай праблемнага падыходу да выкладання рускай гісторыі. Акрамя таго, Ключэўскі акцэнтаваў увагу на гісторыі не дзяржавы, а народа, імкнучыся паставіць на першы план ролю апошняга ў гісторыі. Нарэшце, даследаванне, з ʼяўляючыся вынікам вялікай творчай працы аўтара, было мастацкім па форме і лёгка ўспрымалася. Адзначаныя асаблівасці «Курса» захоўваюць сваю значнасць і ў цяперашні час. Значна складанейшае пытанне аб метадалагічных і ідэйных збудаваннях В. О. Ключэўскага, на якіх узводзіліся і спачывалі яго працы. Зразумела, што аўтар не прытрымліваўся марксісцкага разумення гістарычнага працэсу і сацыяльна-эканамічных фармацый, акрэсліваўшых яго сутнасць, але, як апошні буйнейшы прадстаўнік рускай буржуазнай гістарычнай думкі, ён унёс у яе развіццё шмат цікавага і змястоўнага ў параўнанні са сваімі папярэднікамі. Тэарэтычнае збудаванне В. О. Ключэўскага: геаграфічнае асяроддзе — людское грамадства» (народ) — чалавечая асоба, а таксама прызнанне агульнасці гістарычнага працэсу ў свеце, безумоўна, былі крокам наперад у развіцці рускай буржуазнай думкі.

Будучы патрыётам, ён не прымаў шавіністычных поглядаў аб выключнасці народаў, іх пастаянных асаблівасцях, дадзеных раз і назаўсёды. Быў уважлівы да гістарычных лёсаў усіх народаў, жывучых у Расіі; шмат пісаў пра Беларусь. На жаль, яго адносіны да гэтай праблемы яшчэ не сталі прадметам спецыяльнага даследавання.

Ацэнкі метадалагічных поглядаў гісторыка былі шматлікімі, разнастайнымі, шматпланавымі і, разам з тым, усюды суб ʼектыўнымі. Зразумела, іх супярэчлівасць тлумачылася перш за ўсё ідэалагічнымі поглядамі крытыкаў, але ў значнай ступені яна залежыла ад суб ʼектыўных імкненняў «знайсці» ў Ключэўскага водгук сваіх поглядаў на гісторыю. Такога падыходу не пазбегла акадэмік М. В. Нечкіна, стварыўшая ў 1974 г. цудоўнае даследаванне аб жыцці і творчасці гісторыка. Значнай мадэрнізацыяй вобліка Ключэўскага адрозніваюцца артыкулы К. Кедрава («Наш современник Василий Ключевский».— «Известие», 9.01.1988 г.), амерыканскага даследчыка Т. Эманса і іншых. Думаецца, што такая колькасць поглядаў на гісторыка і яго працы натуральная, таму што сапраўдная навука, сапраўдная дэмакратыя немагчымыя без сутыкнення поглядаў і меркаванняў. Гісторык Ключэўскі быў не толькі вучоным,але і таленавітым пісьменнікам, тонкім псіхолагам і педагогам, цудоўным лектарам.

Ключэўскі патрэбен нашаму часу менавіта сёння, калі ў жыцці краіны, народа праходзяць гістарычныя змены. Гісторыя — заўсёды фактар сучаснасці, асабліва ў пераломныя эпохі.

**В. ЧАРАПІЦА.**



В. О. Ключэўскі. 1841 — 1911

## *Аб значэнні гісторыі*

**«... Без ведання гісторыі мы павінны прызнаць сябе выпадковасцямі, якія не ведаюць, як і навошта прыйшлі ў свет, як і для чаго мы жывём, як і да чаго павінны імкнуцца».**

**«Гісторыя, гавораць тыя, хто не вучыўся гісторыі,... нікога нічому не навучыла. Калі гэта нават і праўда, то гісторыі як навукі нікольні не датычыцца: не кветкі вінаватыя, што сляпы іх не бачыць, але гэта і няпраўда: гісторыя вучыць нават тых, хто ў яе не вучыцца, яна іх правучвае за невуцтва і занядбанне. Хто дзейнічае без яе або насуперак ёй, той заўжды шкадуе аб сваіх адносінах да яе. Яна пакуль што вучыць не таму, як жыць па ёй, а як вучыцца ў яе, яна толькі лупцуе сваіх някемлівых або лянівых вучняў, як страўнік карае прагных або неасцярожных гастраномаў (аматараў паесці,— В. Ч.) не паведамляе ім правілаў здаровага харчавання, толькі даючы ім адчуваць памылкі іх у фізіялогіі...**

**Гісторыя — гэта ўлада: калі людзям добра, яны забываюць пра яе і свой дастатак прыпісваюць сабе самім; калі ім робіцца дрэнна, яны пачынаюць адчуваць яе неабходнасць і цаніць яе дабрадзейства».**

**АБ ЛЕКТАРСКІМ МАЙСТЭРСТВЕ**

**«Гаворачы публічна, не звяртайцеся ні да слыху, ні да розуму слухачоў, а гаварыце так, каб яны, слухаючы вас, не чулі вашых слоў, а бачылі ваш прадмет...уяўленне і сэрца слухачоў без вас і лепш за вас зладзяць з іх розумам».**

**«Каб быць добрым выкладчыкам, трэба любіць тое, што выкладаеш, і любіць тых, каму выкладаеш».**

**ДАСЛЕДАВАННЕ**

# Калі чытаеш Ключэўскага...

За час галоснасці і плюралізма мы яшчэ не адвыклі ад пагібельнай памылкі, што на кожную з ʼяву гісторыі ёсць толькі адзін правільны пункт погляду і мноства памылак. Наша развіццё паказала, што ўсе спробы даць «адзіна правільнае» тлумачэнне гісторыі нідзе нічога не растлумачылі і не адкрылі. Адна падзея адкрылася Карамзіну, другая — Ключэўскаму. Кожная гістарычная з ʼява павінна разглядацца з розных бакоў, але разам з тым патрэбна дробязь — талент гісторыка.

В. О. Ключэўскі, скончыўшы ў 1865 г. гісторыка-філасофскі факультэт Маскоўскага універсітэта, 43 гады сваёй выкладчыцкай дзейнасці прысвяціў вывучэнню станаўлення свабоды ў рускай гісторыі.

Першая праца Ключэўскага «Сказания иностранцев о Московском государстве» з ʼяўляецца «кандыдацкім сачыненнем» студэнта 4 курса. У 1866 г. яна публікуецца ў «Известиях Московского университета».

Некалькі пазней гісторык-марксіст М. Н. Пакроўскі ацэніць «Сказания» Ключэўскага як кнігу «чисто описательную, не стремящуюся ни к каким обобщениям», скажа, што ён прытрымліваецца палажэнняў гісторыка-юрыдычнай школы. Гэтыя палажэнні на доўгія гады стануць вядучымі ў нашай гісторыяграфіі. Але на цяперашні час гэта ўяўляецца мне няправільным.

Наўрад ці растлумачаць гісторыкі, на аснове якіх эканамічных законаў Іван Грозны спаліў і выразаў увесь Вялікі Ноўгарад. Ключэўскі ўсё гэта бачыў скрозь смугу часоў, ён ўлічваў і клімат, і эканоміку, і мноства іншых фактараў. У яго першай працы, чытаючы яе вельмі ўважліва, можна заўважыць зусім новыя для таго часу ідэі: супастаўляючы маскоўскае ўпраўленне з дэмакратычнымі парадкамі на Захадзе, ён займае антысамадзяржаўныя пазіцыі. Так, чужаземец у яго «Сказаниях» ніяк не можа зразумець: «дикость ли народа требует самовластия государя или от самовластия народ так одичал и огрубел». У гэтай працы ўжо ёсць цікавасць Ключэўскага да значэння эканамічных з ʼяў. Гэта была першая на рускай мове праца, прысвечаная аналізу важнага і часам недаступнага або нават невядомага гістарычнага помніка — сказанняў чужаземцаў.

Шэсць гадоў працягваецца праца над «Житиями святых». З усёй масы рукапіснага матэрыялу Ключэўскі адабраў і вывучыў каля 5 тысяч жыцій. Руская агіяграфія ўпершыню ў гісторыі навукі была аб ʼектам менавіта навуковага, свецкага, а не царкоўнага вывучэння. Да Ключэўскага яна была толькі ў галіне выкарыстання царквы і вывучэння духоўных асоб. Рэзкая крытыка прыкрыта акадэмічнымі ветлівасцямі і крайняй стрыманасцю тону: Ключэўскі не хацеў «сварыцца» з царкоўным светам, але ніяк не мог адыйсці ад ісціны. Асноўны вывад — аб неадпаведнасці жыція рэчаіснасці — чамусьці не стаіць у цэнтры працы. Магістэрская дысертацыя «Древнерусские жития святых как исторический источник» напоўнена пошукам праяўлення свабоднай думкі ва ўмовах несвабоды.

Працуючы над «Житиями», Ключэўскі ў 1867 годзе друкуе артыкул «О хозяйственной деятельности Соловецкого монастыря в Беломорском крае». Вывад з гэтай працы важны і новы ў сваім разуменні: манастыр не быў піянерам у засяленні і гаспадарчай распрацоўцы Салавецкіх зямель, а працягваў справу, пачатую раней прамысловымі пасяленнямі.

У час работы над «Житиями святых» была задумана тэма доктарскай дысертацыі: «Баярская дума», з размахам на ўвесь перыяд існавання, ад Кіеўскай Русі да пачатку XVIII стагоддзя. У 1880-81 гг. частка гэтай працы друкуецца ў часопісе «Русская мысль», а праз год, значна перапрацаваўшы тэкст, Ключэўскі выдае яе асобнай кнігай. Ён пісаў: «Палітычная і адміністратыўная гісторыя Баярскай думы цёмная і бедная на падзеі, пазбаўлена драматычнага руху. Закрытая ад грамадства гасударом зверху і дзякам знізу, яна з ʼяўляецца канстытуцыйнай установай з шырокім палітычным уплывам». Баярская дума ў Ключэўскага пры ўсёй сваёй недасканаласці ўсё ж была процівагай адзінаўладдзю і праяўленнем адносна незалежнай палітычнай думкі. Земскія саборы ў яго — зародак выбарнасці і галоснасці для многіх саслоўяў Старажытнай Русі. Земскія саборы і Наўгародскае веча — усё ж праяўленне галоснасці безгалосных эпох. Парадокс, але Земскі сабор быў скліканы пры Іване Грозным, які «хацеў павянчаць апрычніну і Земскі сабор».

Глыбей іншых Ключэўскі адчуваў «анатомію рабства»: «Царь Борис взошел на престол не по праву родства, он не был отягощен прямым участием в злодействах опричнины и, по крайней мере формально, принял власть от Земского собора. Ему следовало всего крепче держаться за свое значение земского избранника, а он пристроился к старой династии по вымышленным завещательным распоряжениям... Проникаешься сожалением, до чего может потеряться человек, хотя бы и царь».

У гэтай працы ўмацоўваецца «антыдваранскі сілагізм» Ключэўскага — аб незаконных правах і узурпацыі ўлады дваранствам, якое з 1762 г. з ʼяўляецца паразітам. Ён лічыць, што з Маніфестам аб вольнасці дваранам губляецца іх права на зямлю, а, значыць, і сялян; што 99 гадоў гэта права трымалася на юрыдычнай фікцыі: «Вельмі дзіўна, але за 18-ым лютага не наступіла 19-ае».

Сялянства ў Ключэўскага — спрадвеку беззямельнае. Даследуючы станаўленне прыгоннага права, ён робіць вывад, што прыгоннае права, створанае шляхам запазычанасці сялян, з ʼяўляецца пагрозай дзяржаве, якая страціла масавага падаткаплацельшчыка. Адсюль тэзіс Ключэўскага аб барацьбе дзяржавы з дваранствам за сялян.

**М. СЯМЁНЧЫК,**
**студэнт IV курса гістфака.**

## *З афарызмаў*

**— Говоруны не бывают умными. Люди, которые легко говорят, обыкновенно трудно понимают.**

**— Есть люди, которые умеют говорить и не умеют ничего сказать. Высшая степень искусства говорить — умение молчать.**

**— Из двух полуумных никогда не составить и одного умного.**

**— Что такое диссертация! Это труд, имеющий двух оппонентов и ни одного читателя.**

**— Христы редко являются — как каметы, но Иуды не переводятся — как комары.**

## *З вершаў*

**Я вспомнил молодость:**
**бывало,**
**Взъерошив темный лес**
**волос**
**Ватага наша разрешала**
**Бездонной вечности**
**вопрос.**
**Бывало вешнею порою,**
**Фуражки сдвинув**
**набекрень,**
**В Нескушном шумною**
**толпою**
**Орем и бродим целый**
**день!**
**И все так просто,**
**так доступно**
**Все трын-трава,**
**все нипочем,**
**И шепчет голос**
**неотступный,**
**Что на «Ура» мы жизнь**
**возьмем.**
**А ныне, в тихий вечер мая,**
**Сидишь, уныло глядя**
**вдаль,**
**Украдкой хрипло**
**напевая:**
**«Кого-то нет,**
**чего-то жаль».**
**И чуешь, по главе**
**плешивой,**
**Как по болоту подо**
**льдом,**
**Играет месяц шаловливый**
**Своим насмешливым**
**лучом.**
**1893 г.**

# МАЦНЕЙШЫЯ Ў СПАРТЫЎНАЙ ГІМНАСТЫЦЫ





Арганізавана прайшло ва універсітэце асабіста-каманднае першынство па спартыўнай гімнастыцы сярод жанчын у праграме кругдагадовай спартакіяды.

Зноў, як і ў мінулым годзе, першае агульнакаманднае месца заваявалі дзяўчаты факультэта педагогікі і методыкі пачатковага навучання. Падрыхтаваў каманду-пераможцу старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання В. В. Мышкевіч. Другое месца ў каманды матэматычнага факультэта, трэцяе — у прадстаўніц біялагічнага факультэта. Далей месцы размеркаваліся такім чынам: 4 — філалагічны факультэт, 5 — факультэт правазнаўства, 6 — фізічны факультэт, 7 — гістарычны факультэт.

У асабістым першынстве ганаровае першае месца заняла студэнтка матэматычнага факультэта Кацярына Мікевіч. Эдзіта Максімчык (факультэт тэорыі і методыкі пачатковага навучання) была другой. Прадстаўніца матэматычнага факультэта Вольга Філабава стала ў спаборніцтвах трэцяй.

**НА ЗДЫМКАХ (левым) пераможцы асабістага першынства (злева-направа) Кацярына Мікевіч, Эдзіта Максімчык, Вольга Філабава;**

**на правым здымку — прызёр агульнакаманднага першынства, каманда дзяўчат факультэта тэорыі і методыкі пачатковага навучання.**

# ЗНОЎ ПЕРШЫЯ

Адбыліся паўфінальныя гульні першынства ВНУ Беларусі па ручному мячу сярод жаночых каманд, у якіх прымалі ўдзел 8 мацнейшых каманд БССР. Каманда Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта паспяхова правяла сустрэчы і зноў заняла першае месца, пакінуўшы ззаду такіх вопытных саперніц, як каманды ІФК, БПІ, Брэсцкага педагагічнага інстытута, Магілёўскага тэхналагічнага інстытута, а таксама Віцебскага тэхналагічнага інстытута.

Пасля двух тураў прызавыя месцы размеркаваліся наступным чынам:

1. ГрДзУ — 24 ачкі;
2. ІФК-Мінск — 20 ачкоў;
3. БПІ-Брэст — 16 ачкоў.

Рыхтаваў каманду па ручному мячу да ўдзелу ў першынстве старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання Міхаіл Фёдаравіч Бура.

**І. БЕЛАОКІ.**

**НА ЗДЫМКУ: зборная па гандболу Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы.**



КЛАСІЧНАЯ БАРАЦЬБА

## Перамога ў Фінляндыі

З 12 па 13 студзеня ў г. Каув-ла (Фінляндыя) праходзіў міжнародны турнір па класічнай барацьбе, у якім прымала ўдзел і зборная каманда нашага Гродзенскага універсітэта, якую ўзначальвалі загадчык кафедры фізічнага выхавання заслужаны трэнер СССР Вячаслаў Максімовіч і старшы выкладчык кафедры фізвыхавання Аляксандр Кудзель.

Каманда нашых барцоў-класікаў выступіла паспяхова: у іх актыве 2 першыя месцы, 3 другія і 1 3-е.

Хацелася б адзначыць поспех дэбютанта міжнародных спаборніцтваў, майстра спорту, студэнта 1 курса факультэта фізічнай культуры Ігара Пяўцова, які стаў мацнейшым у вагавай катэгорыі да 48 кілаграмаў. Паспяхова выступіў на адказных спаборніцтвах наш ветэран, заслужаны майстар спорту выкладчык кафедры фізвыхавання Анатоль Федарэнка, які ўпэўнена выйграў усе сустрэчы і заваяваў галоўны прыз у вагавай катэгорыі да 100 кілаграмаў. Акрамя гэтага Анатоль атрымаў яшчэ і прыз за самую хуткую перамогу — усяго 25 хвілін спатрэбілася нашаму волату, каб «прыпячатаць да каўра» лапаткамі аднаго са сваіх сапернікаў.

Другімі на турніры сталі студэнт 1-га курса факультэта фізічнай культуры майстар спорту СССР Ігар Вараб'ёў — вага 74 кілаграмы; студэнт 2 курса факультэта фізічнай культуры майстар спорту СССР Валерый Цыленць — 82 кілаграмы; студэнт 2 курса факультэта правазнаўства майстар спорту СССР Юрый Цымбарэвіч — 90 кілаграмаў.

III месца ў вазе да 74 кілаграмаў заняў студэнт IV курса матфака майстар спорту СССР Юрый Бойка.

Турнір у Фінляндыі стаў добрай праверкай гатоўнасці нашых барцоў перад Спартакіядай ВНУ БССР, якая адбудзецца ў сярэдзіне лютага ў нашым горадзе Гродна.

**А. СМАЛЯКОЎ.**

Наш адрас: 230023, г. Гродна, вул. Ажэшка, 22, пакой 404, тэл. 44-72-97

Газета выходзіць штотыднёва

Гродзенская абласная ўзбуйненая друкарня вул. Паліграфістаў, 4.

Зак. 591

2000 экз.

Рэдактар Л. С. ЗАСЕЛЬСКАЯ.